ПРАДМОВА

# Краіна, якой ніхто не хацеў

Відаць, для многіх сцверджанне, якое я вынес у назву свайго кароткага ўступнага слова да гэтага нумара, прысвечанага Аўстрыі, можа падацца досыць няпраўдападобным. Няўжо нехта мог не жадаць існавання такой паспяховай сёння дзяржавы, якая ў розных іпастасях прысутнічае на мапе свету (з кароткім перапынкам у гітлераўскія часы) ужо сотні гадоў? І тым не менш, гэта так, у чым вы, спадзяюся, зможаце пераканацца, азнаёміўшыся падрабязней з матэрыяламі гэтага нумара «ARCHE».

Менш за сотню гадоў таму распалася гіганцкая манархія Габсбургаў, ад яе адкалоліся вялізныя абшары, заселеныя пераважна славянскімі народамі ды вугорцамі (у тым ліку, бадай, найбольш развітая ў эканамічным плане Багемія), і новай рэспубліцы, у назве якой парадаксальна застаўся напамін пра колішнюю магутнасць (Аўстрыя па-нямецку — Österreich, «Усходняя імперыя»), дасталася ўсяго няшчасная рэшта — тэрыторыя памерам з дзве вобласці цяперашняй Беларусі, пераважна пакрытая цяжкадаступнымі Альпійскімі гарамі; праўда, з адной з самых культурных сталіц Еўропы і свету — Венай. Шматнацыянальная Аўстра-Вугоршчына разбілася на маленькія краіны паводле нацыянальнай прыкметы, і нямецкамоўныя аўстрыйцы, развітаўшыся са сваімі нядаўнімі суграмадзянамі (харватамі, чэхамі, вугорцамі, славенцамі, славакамі, палякамі...) уваднначас паўсталі перад пытаннем: а мы хто? Немцы? Ці гэткія «аўстрыйскія тутэйшыя»?

На гэтае пытанне гісторыя сама дала адказ: сёння ўжо, відаць, нідзе — ані ў Аўстрыі, ані па-за яе межамі — не ставіцца пад сумнеў існаванне асобнай аўстрыйскай нацыі, але шлях да гэтага быў пакручасты.

Беручыся ўкладаць нумар часопіса, прысвечаны той ці іншай краіне або рэгіёну, я заўсёды імкнуся зыходзіць з таго, што ўсяго, як ні старайся, не раскажаш (уласна, прэтэндаваць на знаўцу ўсяго было б нават смешна), але трэба паспрабаваць чытача зарыентаваць у тэме і зацікавіць ёй, каб ён пры жаданні сам змог працягнуць далейшае з ёй азнаямленне. А каб дасягнуць такога эфекту, нельга абмежавацца паўтарэннем хваласпеваў і клішэ, якія можна вычытаць у турыстычных «гайд-буках» ды «райзэфюрэрах». Таму і ў

гэтым, «аўстрыйскім», нумары «ARCHE» вы знойдзеце таксама шэраг крытычных матэрыялаў самых розных жанраў, прычым, што паказальна, пераважна напісаных самімі аўстрыйцамі.

Як падказвае назва нумара — «Ад імперыі да нацыі», — галоўнай мэтай для мяне як укладальніка было паказаць шлях, развіццё. Развіццё аўстрыйскай дзяржавы, свядомасці, мастацтва, літаратуры ў вельмі драматычны прамежак часу — прыблізна за апошнія 100 гадоў. Таму ў нумары прысутнічаюць і класічныя аўтары першай паловы XX стагоддзя накшталт Франца Кафкі, Штэфана Цвайга, Райнэра Марыя Рыльке, Робэрта Музіля; і майстры слова ды мысляры, якія набылі вядомасць пасля II сусветнай вайны — Інгеборг Бахман, Томас Бэрнхард, Эльфрыдэ Елінэк; і сучасныя папулярныя аўтары — Францобэль, Робэрт і Эва Мэнасэ, Карл-Маркус Гаўс ды іншыя.

Асобна хацелася б звярнуць увагу на рубрыку «Штрыхі да партрэта», у якой на шырэйшым фоне асвятляюцца пэўныя аспекты ці факты аўстрыйскай рэальнасці — напрыклад, з гісторыі развіцця энергетычнай палітыкі (Яраслаў Шэбэк) або прастытуцыі (Жанна Кромер).

І, нарэшце, раю не абмінуць рубрыку «Беларуская Аўстрыя», у якой гісторык Алег Гардзіенка распавядае пра нашых суайчыннікаў, якія апынуліся ў альпійскай рэспубліцы адразу па сканчэнні II сусветнай, прафесар Герман Бідэр расказвае пра свой шлях у беларусістыку, а пісьменнікі Альгерд Бахарэвіч, Вальжына Морт і Анна Кім дзеляцца ўспамінамі пра знаходжанне, адпаведна, у аўстрыйскім Грацы ці беларускім Мінску.

Прыемнага вам адкрыцця Аўстрыі!

*Сяргей Сматрычэнка*